ці, мотавелазавода, ПК Мінскпрамстрой, завода імя Казлова і інш.

Тыя ж аркестры, якія лічацца дзеючымі, на самой справе страцілі большасць сваіх удзельнікаў, а некаторыя, нават, не маюць памяшканняў для рэпетыцыі.

Такое становішча духавых аркестраў сведчыць аб тым, што эра самадзейнай мастацкай творчасці, лічачы па сучасным абставінам, хутчэй за ўсе пойдзе па накірунку заходне-еўрапейскіх краін.

Як вядома, жыццё знойдзе свае выйсце. Замест "самадзейных" хутчэй за ўсе з'явяцца "аматарскія" калектывы. Людзі будуць самі аб'ядноўвацца па інтарэсах, наймаць кіраўнікоў калектываў, арэндаваць памяшканні для заняткаў і г.д.

Дакладчыку давялося асабіста прысутнічаць у Галандыі на конкурсе духавых аматарскіх аркестраў. Уражанне вельмі цікавае і каштоўнае. У параўнанні з нашымі самадзейнымі аркестрамі іх аматарскія аркестры меньшыя па саставу, больш разнастайныя па ўзросту выканаўцаў (ад 15-16 да 60-70 гадоў); больш сціплыя па выканаўчай праграме. Яны не бяруцца за буйныя, цяжкія творы, а, наадварот, у асноўным песенна-стракаты рэпертуар, але ж у вельмі добрым выкананні. Усе удзельнікі прыехалі на конкурс за свой кошт. Арганізацыйны камітэт конкурсу дапамог ім толькі з уладкаваннем жылля і харчу. У выніку свята было для ўсіх, і аматараў-музыкантаў і слухачоў-гараджан.

## СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ СВЯДОМАСЦІ МУЗЫКАНТА У ПРАЦЭСЕ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

А.А.Царова

Даследванне творчай сістэмы выканаўца вызначае шэраг пытанняў, вырашэнне якіх можа даць значны імпульс да удасканальвання працэса яго прафесійнай адукацыі. У гэтых адносінах істотнае псіхалагічнае вымярэнне будуць мець тыя фактары сістэмы, якія утвараюць эфект стымулаў да узнікнення свядомай дзейнасці з вызначаным напрамкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лагічная і эстэтычная мэтазгоднасць сродкаў уздзеяння вызначана самім матэрыялам творчасці выканаўца. Каб зразумець утварэнне сувязей адносін і каардынаванасць, якую дае матэрыял творчасці ў працэсе яго ўспрымання, неабходна знайсці і пабудаваць асаблівы уяўленчы апарат, адпаведны зместавай характарыстыкі дзейнасці выканаўцы.

Прадметна-функцыянальны кантэкст дзейнасці выканаўцы - ажыццяўленне прымальнага выбару сэнсаўтварэння элементаў музычнага твору - мяркуе пранікненне ў самыя дэталёвыя і тэхнічна-канкрэтныя моманты твору.

Спецыфіку мыслення музыканта вызначае матэрыял яго творчасці. Рацыянальнае асэнсаванне спецыфічных структур музычнага твору, заснаваных на музычнай логіцы, дае магчымасць уяўлення некаторых агульных законах музычнага мастацтва. У кожным творчым акце актуалізуюцца структурныя адзінкі і канструкцыі музычнага языка. Музычны язык як структура з'яўляецца падставай вызначэння здольнасці арганізацыі слыхавога ўплыву. Музычны язык як сістэма змяшчае правілы, неабходныя для пабудовы тэксту. Ен з'яўляецца кадыруючай сістэмай, прызначанай для перадачы асаблівай інфармацыі.

Мастацкае мысленне музыканта разумее інфармацыю, якая перадаецца спецыфічным языком, а таксама матэрыяльную структуру, у якой увасабляецца інфармацыя.

Музычнае мастацтва, як і мастацтва наогул, інфарматыўна, а таму яго сэнсавы змест павінен разглядацца ў якасці вызначанай знакавай сістэмы. Музычны знак і ідэальны вобраз апасрэдаваны значнасцю знака, які ў творы выконвае ўздзеянне на механізмы ўспрымання.

Ажыццяўленне прымальнага выбара эфекта сэнсаўтварэння элементаў музычнага твору, але і даць пачуццевы эквівалент вобраза на падставе музычных слыхавых уяўленняў. Прыстасавальная функцыя слыху садзейнічае набыццю вопыта асацыятыўнай сувязі паміж эмоцыямі і сітуацыямі. Патэнцыяльная магчымасць звязаць гук са з'явай рэчаіснасці вельмі важна, так як псіхалагічны механізм мастацкага пазнання заключаны ў супастаўленні з'яў рэчаіснасці з мастацкім эталонам. У музычным мастацтве гэта вобразы, звязаныя з гукавымі характарыстыкамі.

Музычны тэкст як стымульны комплекс, расшыфроўка якога на падставе раскрыцця значнасці знака, задае структуру успрымання выканаўцы. Музычная семіятычная канструкцыя здольна праз псіхічную дзейнасць асобы захоўваць і перадаваць інфармацыю. Адносіны знака з тым, што ен азначае, адлюстроўваюцца ў свядомасці музыканта.

Вобразная мысль кампазітара атрымлівае свае матэрыяльнае ўвасабленне ў кодавай упарадкаванасці музычнага тэкста. Шматразовае суаднясенне гукаў-знакаў з тымі з'явамі, якія яны азначаюць, ствараe псіхалагічную падставу выкарыстання іх у якасці матэрыяла структуіравання канфігурацыйных музычных уяўленняў.

Успрыманне цесна звязана з канкрэтным характарам стымулаў, якія вызначаюць псіхалагічны настрой асобы выканаўцы. Неабходна спецыяльная накіраванасць свядомасці музыканта на ўяўленне элементаў музычнага языка і яго індывідуалізаваныя формы ужывання ў розных кантэкстах.

На матэрыяле супастаўлення структур можна разглядаць пытанне аб значнасці элементаў інтанацыйнай праграмы, распазнаванне комплекса элементаў, якія нясуць сэнсавую нагрузку. Менавіта тыя структуры тэкста, якія адпавядаюць разуменню выканаўцы, з'яўляючыся на ўзроўні некаторых супольных уздзеючых фактараў, пранізваюць кожны акт творчай свядомасці. Такім чынам выканаўца тую сістэму свайго успрымання ставіць ва ўмовы вызначанай знакавай сістэмы музычнага тэксту.

## ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ КНІЗЕ

В.С.Варапаева

Негарманная сувязь пакаленняў забяспечвае рух гісторыі, прагрэс чалавецтва. Дзяцінства ж звязвае нас з мінулым і будучым. Дзеці – нашчадкі ўсей грандыёзнай працы чалавецтва і выхаванне іх – вышэйшая важная для кожнага грамадства задача. Дзіцячая літаратура – менавіта той эфектыўны сродак, які садзейнічае выхаванню. Таму і ў аснове яе павінна ляжаць канцэпцыя шырокага гу-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ